# Педагогіка, псіхалогія

У. Н. РАДЗІЁНАЎ

## ВУЧЭБНАЯ КНІГА ЯКУБА КОЛАСА

70 гадоў назад у «Кніжным летапісу» № 5 за 4 (17) лютага 1910 года з'явілася першае паведамленне аб выхадзе ў свет «Другога чытання для дзяцей беларусаў» Якуба Коласа. Рукапіс гэтай вучэбнай кнігі, створанай маладым настаўнікам Канстанцінам Міхайлавічам Міцкевічам, ужо некалькі гадоў ляжаў у выдавецтве суполкі «Загляне сонца і ў наша аконца». Працуючы ў глухіх вясковых школах, малады педагог, выхаванец Нясвіжскай настаўніцкай семінарыі, асабліва востра адчуваў, як патрэбна кніга на роднай мове для тых, каго ён навучаў. Такія вучэбныя кнігі сталі і для маладога настаўніка проста неабходнымі, калі давялося паўзімы працаваць у паўлегальнай школе ў вёсцы Сані (цяпер Талачынскі раён), дзе навучанне ён вёў на беларускай мове. Было гэта яшчэ ў 1906 годзе. У пэўнай меры ідэя стварыць хрэстаматыю-чытанку на роднай мове тлумачылася і тым, што на свет ужо з'явіліся «Беларускі лемантар або Першая навука чытання» і «Першае чытанне для дзетак беларусаў». Якубу Коласу, па яго прызнанні, захацелася «працягнуць гэта цудоўнае пачынанне». Трэба сказаць, што ў тыя гады ў Віленскай вучэбнай акрузе прымаліся неаднаразовыя спробы стварыць новыя падручнікі па прыкладу навучальных кніг К. Д. Ушынскага. Аднак усе яны не ішлі ні ў якое параўнанне з тварэннямі славутага рускага педагога. Шчаслівым выключэннем стала «Другое чытанне...» — кніга амаль невядомага настаўніка, які да таго ж яшчэ схаваўся пад псеўданімам Якуб Колас.

Стварэнне «Другога чытання...» — гэта вялікі грамадзянскі і педагагічны подзвіг. Сам Канстанцін Міхайлавіч тады знаходзіўся пад наглядам паліцыі і як «недобранадзейны» быў пазбаўлены права працаваць у школе і пражываў на выпадковыя заработкі, чакаў выкліку ў суд за арганізацыю нелегальнага настаўніцкага з'езду ў Мікалаеўшчыне. Зусім не было мастацкіх тэкстаў, бо родная літаратура рабіла яшчэ першыя спробы ў стварэнні твораў для дзяцей. Іх належала пісаць самому. Да таго ж погляды Якуба Коласа на мэту навучання, шляхі і метады выкладання ў школе значна адрозніваліся ад афіцыяльных. Вялікае значэнне тут мелі не толькі ўласны вопыт работы ў школе, знаёмства з творамі педагогаў-дэмакратаў, але і лекцыі Ф. А. Кудрынскага, выкладчыка Нясвіжскай настаўніцкай семінарыі, які імкнуўся даць сваім выхаванцам усё прагрэсіўнае ў навучанні і выхаванні. Запісванне беларускага фальклору па заданні Ф. А. Кудрынскага стала своеасаблівым штуршком для асэнсавання народнай педагогікі і разам з тым асновай, якая дазволіла зразумець і асэнсаваць ідэю К. Д. Ушынскага аб значэнні роднай мовы ў духоўным развіцці дзіцяці. Вялікі рускі педагог сцвярджаў, што зусім не абыякава, на якой мове яно гаворыць. «Засвойваючы родную мову, — пісаў К. Д. Ушынскі, — дзіця засвойвае не адны толькі словы, іх спалучэнні і відазмяненні, але бясконцае мноства паняццяў, поглядаў на прадметы, мноства думак, пачуццяў, мастацкіх вобразаў, логіку і філасофію мовы — і засвойвае лёгка і хутка, за два — тры гады, столькі, што і паловы таго не зможа засвоіць у дваццаць гадоў старанйай і метадычнай вучобы. Гэта вялікі народны педагог — роднае слова»[1].

Вучэбная кніга Якуба Коласа адразу ж выклікала станоўчыя водгукі ў дэмакратычным друку. Напрыклад, у часопісе «Украïнська хата» (1910, № 4) адзначаліся многія добрыя бакі «Другога чытання...» і перш за ўсё народнасць і патрыятызм. Падкрэслівалася, што кніга створана з улікам «патрабаванняў педагогікі і прыцягвае сваёй паэтычнасцю». Аднак напрамак кнігі беларускага пісьменніка-педагога не адпавядаў рэакцыйнай палітыцы царызму. У ёй, напрыклад, не было тэкстаў рэлігійнага зместу, хоць у тыя часы лічылася, што іх абавязкова павінны мець усе вучэбныя кнігі. Падручнік Якуба Коласа ўтрымліваў ярка выражаны свецкі, сацыяльна-палітычны характар і быў разлічаны на разумовае развіццё дзяцей беларускіх сялян. Пра гэта сведчыць і той факт, што цэнзура зняла з кнігі такія сатырычныя тэксты, як «Пан і рэчка», «Баба і куры», «Пастух і авечка», а з вершаў «Стогі» і «Вясковыя дзеці» зніклі строфы, якія мелі ярка выражаны сацыяльны змест, пратэст супраць бяспраўнага становішча працоўнага народа.

Кніга беларускага педагога складзена ў асноўным па ўзору папулярнага ў той час падручніка К. Д. Ушынскага «Роднае слова» і шмат у чым ішла ўслед за яго педагагічнай сістэмай. Тут бачна жывая сувязь Якуба Коласа-педагога з рускай рэвалюцыйна-дэмакратычнай традыцыяй, з педагагічнымі ідэямі К. Д. Ушынскага.

«Другое чытанне...» з'явілася таксама своеасаблівым адлюстраваннем палітычнай абстаноўкі таго часу, барацьбы перадавога настаўніцтва Беларусі за школу новага тыпу, ідэй К. Д. Ушынскага аб народнай асвеце. Тэксты вучэбнай кнігі сведчаць аб тым, што іх аўтар глыбока разумеў неабходнасць стварэння новай школы, якая павінна быць цесна звязана з патрэбамі народнага жыцця, з увядзеннем роднай мовы як асновы навучання. Пісьменнік-педагог быў перакананы, што школа можа і павінна развіваць розум дзяцей, абуджаць іх свядомасць. І дасягне яна гэтага толькі тады, калі вучні будуць свабодна выкладаць свае думкі вусна і пісьмова на роднай мове. Пад уплывам ідэй Ушынскага ён лічыў, што іменна «школа павінна задавальняць патрабаванне народа ў роднай мове»[2].

Аналіз «Другога чытання...» пераканаўча паказвае, што ў рабоце над вучэбнай кнігай Якуб Колас улічваў вопыт стварэння падручнікаў не толькі К. Д. Ушынскім і Л. М. Талстым, але і «Першага чытання для дзетак беларусаў» Цёткі. Так, напрыклад, у параўнанні з кнігай Цёткі тэксты ў вучэбнай кнізе Якуба Коласа больш адпавядаюць узросту дзяцей, больш рознабакова адлюстроўваюць жыццё, захоўваюць паслядоўнасць, адзінства стылю і мастацкай мовы. У выніку «Другое чытанне...» стала і пэўным этапам на шляху станаўлення нацыянальнай літаратуры для дзяцей. Пісьменнік-педагог прытрымліваўся таго пункту погляду, што спецыфічныя патрабаванні да дзіцячай кнігі, у тым ліку і вучэбнай, павінны зыходзіць з асаблівасцей дзіцячага ўспрымання. Ствараючы «Другое чытанне...», Якуб Колас бачыў сваю задачу не толькі ў тым, каб даць дзецям матэрыял для чытання і тым самым пашырыць іх кругагляд, прабудзіць дапытлівы розум і пачуццё чалавечай годнасці, навучыць эстэтычнаму ўспрыняццю з'яў, выхаваць высокія грамадзянскія і эстэтычныя ідэалы. У коласаўскай кнізе спалучаны ў адно два працэсы: засваенне роднай мовы і вывучэнне навакольнай прыроды. На гэтай аснове пісьменнік-педагог вырашаў і трэцюю важнейшую задачу — выхаваўчага навучання. Кніга Якуба Коласа давала сялянскім дзецям магчымасць замацаваць свае пазнанні, пашырыць свае пазнавальныя магчымасці, выхоўваць лепшыя маральныя пачуцці. Менавіта для гэтага і прызначалася вучэбная кніга, якую мог чытаць 9—10-гадовы школьнік, потым расказваць змест, разважаць. Пісьменнік-педагог не кананіраваў народную мову, а рабіў руплівы адбор характэрных для народа слоў, фразеалагізмаў, выразаў.

Апрацаваныя пісьменнікам-педагогам тэксты славяць жыццёвую сілу працоўнага чалавека, сцвярджаюць веру ў яго перамогу над злом. Уключыўшы ў сваю кнігу некалькі твораў К. Д. Ушынскага, Ф. Багушэвіча, Цёткі, аўтар быў вымушаны сам напісаць мноства вершаў, баек, апавяданняў, казак, вучэбных тэкстаў. Пры гэтым ён імкнуўся, каб усё было простым па пабудове сюжэта і па мове. Сказы набліжаны да народнай мовы, у іх добра схоплена ўласцівая гутарковай мове трапнасць. Пісьменнік-педагог размяшчаў матэрыялы, прытрымліваючыся прынцыпу паслядоўнасці, па ступені нарастаючай складанасці, ускладнення ідэйнага зместу, тэматыкі і разам з тым стылю і мовы твораў.

Даследчыкі педагагічнай спадчыны Якуба Коласа падкрэсліваюць, што

пісьменнік-педагог у пазнанні дзецьмі аб'ектыўнага свету вялікае значэнне надаваў прыродзе. Ведаючы дзіцячую ўражлівасць, аўтар «Другога чытання...» стварыў яркія зрокавыя вобразы, якія не толькі запаміналіся, але і прывучалі да прыгожага. Улічваючы імкненне дзіцяці асэнсаваць і «дацаць» сваё, Якуб Колас стварае такія малюнкі прыроды, якія б выклікалі ў малых актыўнае ўяўленне, пачуццё, давалі б штуршок для разважання. Паэтычныя карціны беларускай прыроды ёсць і ў вершах, і ў празаічных творах. Аўтар турбаваўся не толькі аб эстэтычным выхаванні, але многае тлумачыў, даводзіў, павучаў, імкнуўся выхаваць назіральнасць. Невялікія па аб'ёму тэксты апавяданняў, казак, артыкулаў мелі мэтай прывучаць проста і ясна выказваць свае думкі. Разам з тым, гэта стварала магчымасць ажыццяўляць прынцып нагляднасці ў навучанні, актыўным прыхільнікам якога быў сам аўтар вучэбнай кнігі. Хочацца падкрэсліць і яшчэ адну асаблівасць коласаўскага «Другога чытання...» Пісьменнік-педагог не толькі расказваў сваім чытачам аб жыцці працоўнага народа, аб школе і працы, аб роднай прыродзе. Аўтар паступова падводзіў школьнікаў да разумення шэрагу сацыяльных пытанняў. Паказваючы без прыхарошвання, няхай і ў алегарычнай форме, сацыяльнае жыццё сялянства, барацьбу з сіламі зла і гвалту, прыгнечання, славячы лепшыя рысы чалавека-працаўніка і высмейваючы недахопы, характэрныя для прадстаўнікоў пануючага класа, аўтар кнігі тым самым спрыяў росту і ўмацаванню лепшых якасцей дзіцячай душы, развіццю самасвядомасці.

Стварэнне і выхад у свет «Другога чытання...» пераканаўча сведчыць аб тым, што малады Якуб Колас сваёй дзейнасцю яшчэ да Кастрычніцкай рэвалюцыі спрыяў развіццю педагагічнай думкі ў Беларусі. З'яўленне кнігі было важнай грамадска-палітычнай падзеяй у барацьбе перадавой інтэлігенцыі за сацыяльную самасвядомасць беларусаў, за дэмакратызацыю выхавання і навучання на роднай мове. Гэта таксама сведчанне прагрэсіўнасці поглядаў самога Якуба Коласа, уся літаратурная і педагагічная дзейнасць якога была прысвечана справе народнай асветы, імкненню ўвесці ў школу ўсё лепшае, прагрэсіўнае, створанае рэвалюцыйна-дэмакратычнай педагогікай.

[1] Ушинский К. Д. Избранные педагогические произведения в 2-х томах.— М., 1974, т. 1, с. 149.

[2] Гл.: Наша ніва, 1914, № 18.

В. М. РЕЙЗИН, В. С. ХРЕНОВ

# САМОСТОЯТЕЛЬНЫЕ ЗАНЯТИЯ ФИЗИЧЕСКИМИ УПРАЖНЕНИЯМИ В БЮДЖЕТЕ ВРЕМЕНИ СТУДЕНТОВ

Большое значение в растущей интенсификации учебного процесса имеет широкое использование студенчеством в режиме дня средств физической культуры, что способствует не только укреплению здоровья, приобретению ценных личностных качеств, но и поддержанию оптимального уровня умственной работоспособности. В этом плане немаловажную роль играют самостоятельные занятия физическими упражнениями.

С целью изучения места физической культуры и спорта в режиме дня студентов нами в Белгосуниверситете имени В. И. Ленина проводилось конкретное социологическое исследование, в котором был использован метод анкетного опроса. В нем участвовало 915 студентов 1—4 курсов девяти факультетов (10,5% генеральной совокупности). Полученные материалы подверглись обработке на ЭВМ «Минск-32» с определением одно- и двумерных зависимостей.

Для выявления места самостоятельных занятий физическими упражнениями в бюджете времени студентов в анкету были включены специальные блоки вопросов, анализ ответов на которые позволил в определенной степени осветить проблему. На вопрос «Занимаетесь ли Вы физическими упражнениями самостоятельно?» только 24% участников опроса ответило утвердительно. Однако в процессе изучения ответов на последующие вопросы выяснилось, что это число в действительности значительно больше.